Несмотря на субсидиарный характер деятельности омбудсмена, ее эффективность обеспечивается, с одной стороны, особенностями конституционно-правового и социального статуса, а с другой – преимуществами этого института перед иными правозащитными механизмами. Среди таких преимуществ бесплатность оказания служебных услуг заинтересованным лицам, отсутствие необходимости присутствия адвокатов или поверенных в делах, упрощенная процедура обращения, оперативность разрешения дел.

В контексте судебно-правовой реформы, проводимой в Республике Беларусь (расширение сферы применения посреднических процедур, создание Следственного комитета, обсуждение возможности внедрения института прямой конституционной жалобы), институт Уполномоченного по правам человека, учреждение которого вытекает из логики не только конституционных положений, но и международных обязательств Республики Беларусь, должен успешно вписаться в национальную правовую систему, особенно если учесть, что такой законопроект уже вносился на рассмотрение в парламент в 1996 г. В качестве же правового эксперимента, который позволит не только деполитизировать данный вопрос, но и сформировать доверие у граждан к подобному институту, необходимо создать институт специализированного Уполномоченного по правам ребенка.

*Т. А. Красніцкая*
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук І. У. Вішнеўская
БДЭУ (Мінск)

## ЗМЕНЫ Ў ПРАВАВЫМ СТАНОВІШЧЫ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ ПАСЛЯ ПАДЗЕЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у этнічнай і канфесійнай структуры на Беларусі ў складзе Расійскай імперыі адбыліся пэўныя змены. Найбольш значныя змены закранулі яўрэйскае насельніцтва. У адпаведнасці з увядзеннем так званай «мяжы яўрэйскай аселасці» і высяленнем яўрэяў з сельскай мясцовасці іх доля ў гарадскім насельніцтве колькасна пераважала ўсе іншыя нацыянальныя пласты.

На першым этапе нельга было казаць пра дыскрымінацыйнае заканадаўства. Улады амаль што не ўмешваліся ў жыццё яўрэйскай абшчыны, і яна захоўвала пэўную аўтаномію. Спачатку праводзілася палітыка «заспакаення» заходніх губерняў. Кацярына II у 1772 г. вызначыла для яўрэяў аднолькавыя з сялянамі і купцамі-хрысціянамі падаці. Адміністрацыйнае кіраванне ўсклалі на кагал, які заставаўся пакуль што асноўнай адзінкай грамадскага жыцця.

Указ ад 23.12.1791 г., дзе ўпершыню з'явілася паняцце «рысы аселасці», паклаў пачатак дыскрымінацыйнаму заканадаўству. У 1802 г. быў створаны «яўрэйскі» камітэт, які распрацаваў да 1804 г. «Палажэнне пра

яўрэяў», паводле якога забаранялася пражыванне яўрэяў у сёлах і вёсках, паколькі яны былі запісаны да мяшчанскага і купецкага саслоўя. Таксама прадугледжваўся трохгадовы тэрмін іх перасялення ў гарады і мястэчкі ці незаселеныя паўднёвыя землі. А ўжо ў 1807 г. быў выдадзены ўказ аб прымусовым перасяленні яўрэяў з паселішчаў у гарады: каб да 1810 г. «никто из евреев в селах на жительство не оставался». Але ўсе гэтыя мерапрыемствы не стабілізавалі, а толькі ўскладнілі становішча.

У 1835 г. было прынята новае «Палажэнне пра яўрэяў». Паводле яго яўрэі дапускаліся на дзяржаўную службу толькі пры наяўнасці вышэйшай адукацыі. Падпарадкоўваліся яўрэі агульнаму кіраванню, скасоўваліся кагалы і прадугледжвалася карэнная перабудова яўрэйскага жыцця з мэтай набліжэння яго да агульнаімперскіх стандартаў. Заканадаўчыя акты сведчылі аб тым, што ў дзяржаўнай палітыцы ў адносінах да яўрэяў пачаў дамінаваць рэлігійны аспект, скіраваны на памяншэнне ўплыву іудаізму, у першую чаргу праз свецкую адукацыю моладзі. Падчас прыняцця абмежавальных прававых актаў расійскія ўлады кіраваліся некалькімі матывамі. Па-першае, веравызнальным, па-другое, эканамічным, па-трэцяе, – фіскальным. Урад імкнуўся разбурыць адасобленасць яўрэяў і злучыць іх з астатнім насельніцтвам.

Надалей палітыка станавілася ўсе больш рэпрэсіўнай. Падчас рэформы 1860-х гг. становішча яўрэйскага насельніцтва некалькі палепшылася, але ў 1880-я гг. пачалася новая хваля абмежавальных мерапрыемстваў.

У выніку аналізу заканадаўчых актаў, выдадзеных расійскім урадам, можна сцвярджаць, што большасць законаў спачатку не мела абмежавальнага ці рэпрэсіўнага характару, а набыла яго ў выніку дзеяння мясцовай адміністрацыі ці органаў гарадскога самакіравання. У некаторых губернях гэта было абумоўлена ранейшымі адносінамі мясцовага насельніцтва да яўрэяў. Мерапрыемствы ўрада праследавалі на беларускіх землях адзіную мэту – уніфікацыю правоў, ладу жыцця і мыслення ўсяго далучанага да Расійскай імперыі насельніцтва.

Але падобная палітыка мела такую скіраванасць не да ўсіх народаў. У дачыненні да іншых этнічных меншасцей Беларусі расійскія ўлады не распрацоўвалі спецыяльных праектаў мадэрнізацыі і інтэграцыі ў імперскае грамадства. Напрыклад, татары не змянілі свайго прававога становішча, а палякі захавалі палітычныя, рэлігійныя і эканамічныя свабоды. Найбольш абмежавальны характар мела «яўрэйскае заканадаўства».



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by